# «ЛЕН1Н ДУМАЕ ПРА БЕЛАРУСЬ»: СТАУЛЕННЕ У. ЛЕН1НА ДА ДЗЯРЖАУНАСЩ БЕЛАРУС1

**А. В. Траф1мчык**

*Беларуси дзяржауны утвератэт культуры*

У пстарычнай навуцы Беларум пытанне пра адносіны шраунщтва бальшавіцкай партыі і кірауніцтва савецкай крашы да станаулення беларускай дзяржаунасщ дасюль не мае пэунага канкрэтнага адказу, наколькі ж і як спрычыніліся бальшавікі да вырашэння гэтай праблемы, якая востра паустала у 1917 г., паустала нечакана, прычым нават для саміх актывістау беларускага нацыянальнага руху. Таму беларускім гісторыкам варта зараз збіраць «зярно к зярняці» (Янка Купала), даследуючы пааспектна сваё мЬ нулае, каб сфарміраваць яго цэласную карщну. Адным з такіх аспектау з'яуляюцца погляды лідара бальшавшоу У. Леніна адносна дзяржаунасці на беларусшх землях.

Незалежніцкія тэндэнцыі у нацыянальнай эліце беларусау у 1918 г. мелі гістарычныя і прававыя передумовы. Прынятая адразу пасля захопу улады бальшавікамі «Дэкларацыя правоу народау Расіі» гарантавала нацыям права на вольнае самавызначэнне аж да аддзялення і утварэння самастойнай дзяржавы. Больш таго, 29 жніуня 1918 г. савецш урад прыняу падтсаны У. Леніным дэкрэт аб адмове ад дагаворау і актау, заключаных урадам былой Расійскай імперыі аб падзеле Рэчы Паспалітай. А гэта значыць, расійская інкарпарацыя беларускіх зямель, яшя з'яулял^я ядром ВКЛ, de iure ліквідавалася, а за іх насельніцтвам прызнавалася права на самавызначэнне - калі яны адмовіліся б ад ранейшага дзяржаунага status quo у выглядзе ВКЛ ці Рэчы Паспал^ай. Выбар палякау, літоУцаУ, украшцау быу зроблены на карысць самастойнага шляху дзяржаунага будаунщтва, што фактычна беларусам не пакідала альтэрнатывы у выпадку самастойнага вырашэння свайго лёсу.

Аднак спроба такога сепаратызму, хай і з савецка-сацыялістычным ухшам, была ліквідавана праз разгром Усебеларускага з'езду. У. Ленш аддавау ГерманН дзеля яе узмацнення ладны пас тэрыторыі нядауняй імперыі, у тым лшу Беларусь, рыхтуючыся да распаусюду рэвалюцыі [9], тым самым пнаруючы лозунгі аб самастойнасщ Беларусі.

Акупацыйных намерау Савецкай Расіі У. Ленш не хавау. У яго тэлеграме да І. Вацэмса ад 29 л^тапада 1918 г. ён называе украшскія і прыбалтыйскія землі акупаванымі, адзначаючы пры гэтым, што стварэннем абласных часовых урадау адшмаецца магчымасць разглядаць рух бальшавіцкіх войск як акупацыю [6]. Бальшавіцкі правадыр пры гэтым дбау пра мшмум вонкавай прыстойнасці [16].

Аддзяленне ад Расп, як дэкларуе У. Ленш, дапускалася бальшавіцкімі уладамі для ЭстонН, Латвіі, Літвы, Украіны. Беларусь такога гонару не мела, але тольш фармальна: «Мы за *автономию* **для всех** частей, мы за *право* отделения (а не *за отделение* всех!) <...> В общем, мы против отделения. Но мы стоим за право на отделение. <... > *Ничего,* абсолютно ничего кроме *права* на отделение здесь нет и быть не должно» [8]. Выкрывае У. Ленша у фарысействе і І. ^наценка: «На пытанне: "што вышэй - права нацый на самавызначэнне або сацыялізм?"» У. Ленш адказвау: «сацыялізм вышэй». «Щ дазволена з-за парушэння права нацый на самавызначэнне аддаваць на з'яданне Савецкую сацыял^тычную рэспублшу, падстауляць яе пад удары імперыялізму у момант, калі імперыялізм заведама мацнейшы, Савецкая рэспубліка заведама слабейшая? Не. Не дазволена. Гэта не сацыял^тычная, гэта *буржуазная* палггыка». З ташм тлумачэннем У. Ленша можна было б пагадзщца тольш пры адной умове, калі б размова ш л а аб абароне сацыял^тычнага грамадскага ладу. Але у той час такая умова адсутшчала. Рэвалюцыя, якая адбылася у кастрычшку 1917 г., не з'яулялася сацыял^тычнай, не было таксама і сацыял^тычнага грамадскага ладу. Да 1920 г. У. Ленш быу упэунены у тым, што у кастрычніку 1917 г. сацыял^тычнай рэвалюцыі у РасН не было [2]. Само шраунщтва савецкай краіны маркіравала свой прыход да улады у 1917 г. пераважна пераваротам.

Нягледзячы на тое, што яшчэ летам 1916 г. У. Ленш не зга-джауся з тымі, хто адмауляу няспеласць украшскага і беларускага нацыянальных рухау [4], на справе бальшавікоУ не тольш не турбавала пытанне пра беларускую дзяржаунасць, але і прыУносіла лішнія складанасці у распаусюджванш рэвалюцыі. Пакуль беларускі нацыянальны рух (як, зрэшты, і шшыя) набывау сілу пад царскай уладай, ён каталізавауся бальшавікамі, бо ташм чынам расхіствауся царызм. Яшчэ на самым пярэдадш кастрычніцкага перавароту У. Ленш, што праўда, у форме рытарычнай фігуры умоунага ладу заяуляу пра «немедленное восстановление *полной* свободы Финляндии, Украины, Белоруссии, для мусульман и т. д.» [5]. Пасля захопу бальшавікамі улады нацыянальныя рухі сталі

замшаць іх палітыцы, што вяло да імкнення мінімізаваць ці фармалізаваць ташя рухі, а беларускі - спачатку на пэуны час увогуле аказауся «па-за гульнёй».

Тым не менш задумш бальшавікоУ на тым этапе не заусёды адпавядалі іх стратэгіі распаусюджвання савецкай улады на крашы Заходняй Еуропы. Правал саветызацып Літвы і Польшчы, якая тым больш адразу выявіла імперскія амбіцыі, запатрабавау ад Крамля аператыунага і прагматычнага вырашэння беларускай праблемы. Беларусь замест Польшчы стала звяном, якое замкнула ланцуг савецшх рэспублш уздоуж заходняй мяжы. Але ужо у пачатку 1919 г., г. зн. адразу пасля першага абвяшчэння Савецкай Беларусь У. Ленш адзначау, што рэспублша буферная і патрэбна тольш таму, што мяжуе з іншымі крашамь а што тычыцца трох яе усходшх губерняу, то іх можна выключыць са складу рэспублшь бо яны не мяжуюць з іншымі краінамі [14].

У. Ладысеу насуперак і гістарычным дакументам, і сва1м ранейшым працам у якасщ лейтматыву адарвання трох губерняу ад БССР вылучае гаспадарчы фактар: мауляу, тыя рэгіёны быт эканамічна знітаваны з Цэнтральнай Раияй [3]. Па-першае, аутар спасылаецца на дакументы (дагэтуль нібыта малавядомыя), створаныя за год да таго адарвання, а итуацыя ж змянялася тады часам ледзь не штодзённа. Па-другое, падобныя погляды адзначаліся дауно: такую думку знаходзім у манаграфи Н. Каменскай, выдадзенай у 1957 г. [12]. Па-трэцяе, хіба ж пашнутыя БССР Мінская і Гродзенская губерні былі меней штэграваны у агульнарасійскую эканоміку, хіба іх гаспадарка арыентавалася на Захад? Больш таго, беларусшя нацыянал-камушсты у пачатку 1920-х гг. даводзшь што якраз эканамічна адарваныя губерні складаюць з Мшскай адзін вытворча-гаспадарчы і этнаграфічны беларускі механізм [1]. У. Ленш у сувязі са стварэннем гаспадарчай базы савецкай кра1ны на Беларусь не звяртае увап - у адрозненне, напрыклад, ад стратэпчна важнай у гэтым сэнсе Украшы [10].

Савецка-польская вайна прывяла да заключэння мірнага дагавора. У Рызе бальшавіцкая беспрынцыпнасць была чарговы раз прадэманстравана. Калі яшчэ летам 1920 г. Масква дамагалася правядзення савецка-польскай мяжы па «лши Керзана», дык праз некалькі месяцау яна ахвяравала усёй новастворанай Савецкай Беларуссю. Больш таго, 23 верасня 1920 г. Усерасшсш выканаучы камітэт звярнууся да кірауніцтва Польшчы з прапановай адшнуць пытанні аб самавызначэнні народау, а абмежавацца устанауленнем усходняй граншы Польшчы [11]. У Леніна знаходзім выказванне на гэту тэму (ад 2 кастрычшка 1920 г.): «Линия проходила так, что

Минск оставалася у поляков, вся Белоруссия была у них. И не только Совет Народных Комиссаров, но и Президиум ВЦИК - высший орган РСФСР - торжественно, в специальном обращении заявил польскому народу, что он предлагает мир, что он отказывается от решения оружием вопроса о судьбе Белоруссии, которая никогда польской не была. <...> Но мы тем не менее заявили самым официальным, самым торжественным образом, что мы предлагаем мир на тогдашней линии. <...> Я напоминаю вам об этом, чтобы во всех речах, которые вам придется вести по этому вопросу, более энергично подчеркнули, что вначале мы предлагали мир на линии более восточной, чем теперешняя» [7]. Як пракаменщравау тую сгтуацыю беларуска-польсш шсьменшк С. Яновіч, «палякам Ленш аддавау пасля і Менск, але яны не захацел^ расшыфраваушы бальшавщкую задуму накармщь "польскага гусака" меншасцямі да такое ступеш, што скончыуся б з абжорства...» [18]. Як мяркуе польсш псторыкбеларус Ю. Туронак, бальшав^ загадзя рыхтавал^я аддаць Польшчы частку беларусшх абшарау - тую, што уваходзша у склад Лггбел, каб маншуляваць ёю «як тэрыторыямі зь неакрэсьленым дзяржауным статусам, яшя у залежнасьці ад канкрэтнага ваеннапалітычнага становішча маглі быць перададзеныя у сфэру уплыву Польшчы щ Расеі або падзеленыя паміж імі». А падчас заключэння мірнага дагавора у Рызе ужо ва уступнай фазе перамовау шраушк савецкай дэлегацыі А. Іофе быу схшьны аддаць Беларусь пад уплыу Польшчы на узамен за прызнанне ёю Савецкай Украіны [17].

Яшчэ праз пэуны час, 22 верасня 1922 г., І. Сталш у пасланш У. Леніну называе утварэнне БССР і іншых рэспублік «игрой в независимость»: «.За четыре года гражданской войны, когда мы ввиду интервенции вынуждены были демонстрировать либерализм Москвы в национальном вопросе, мы успели воспитать среди коммунистов, помимо своей воли, настоящих и последовательных социал-независимцев, требующих настоящей независимости во всех смыслах. < . > Мы переживаем такую полосу развития. когда молодое поколение коммунистов на окраинах игру в независимость отказывается понимать как игру, упорно признавая слова о независимости за чистую монету и также упорно требуя от нас проведения в жизнь буквы конституции независимых республик» [15].

Потым лёс Беларуи у многім вырашауся ужо непасрэдна Сталіным. Для яго закладзеныя Леншым тэндэнцыі сталі канцэптуальнай асновай. Галоунай з іх з'яуляецца выкарыстанне Беларусі як сродку у барацьбе па распаусюджванш бальшавізму ці, як падагульніу Сталін яшчэ пры жыцщ Леніна, «принцип на самоопределение должен быть средством борьбы за социализм» [па: 13].

## Л1таратура


1. Доклад в Ц.Б. Коммунистической партии Белоруссии // Паміж Усходам і Захадам: Станауленне дзяржаунаспД і тэрытарыяльнай цэласнасці Ееларусі (*191 7-1939* гг.) / У. Ф. Ладысеу, П. І. Брыгадзш. - Мшск, 2003.- С. 287-291.
2. *1гнаценка, І. М.* Наша псторыя / І. М. ^наценка // ВеспД Нацыянальнай акадэмп навук Еесларусі. Серыя гуманггарных навук. - 1999. - № 1. - С. 7.
3. *Ладысеу, У.* Расйсы фактар і беларуская дзяржаунасць у 20-я гады XX ст. / У. Ладысеу // Беларуская думка. - 2006. - № 2. - С. 117-118.
4. *Ленин, В.И.* Полное собрание сочинений / В. И. Ленин. - М., 1980. - Т. 30. - С. 89.
5. *Ленин, В. И.* Полное собрание сочинений / В. И. Ленин. - М., 1981. - Т. 34. - С. 299.
6. *Ленин, В. И.* Полное собрание сочинений / В. И. Ленин. - М., 1974. - Т. 37. - С. 234.
7. *Ленин, В. И.* Полное собрание сочинений / В. И. Ленин. - М., 1974. - Т.41. - С. 319-320.
8. *Ленин, В. И.* Полное собрание сочинений / В. И. Ленин. - М., 1982. - Т.48.- С. 233-236.
9. *Ленин, В. И.* Полное собрание сочинений / В. И. Ленин. - М., 1975. - Т.54.- С. 490-491.
10. *Ленин, В. И.* Сочинения / В. И. Ленин. - М., 1955. - Т. 29. - С. 64-66,234-235, 248.
11. *Лтвт, А. М.* Пакт Рыбентропа - Молатава і Беларусь: да пытання вывучэння праблемы аб'яднання Усходняй і Заходняй Беларус / А. М. Лггвш // Беларусь і Герма^я: псторыя і сучаснасць: Матэрыялы міжнар. навук. канф., Мшск, 22 крас. 2004 г. / гал. рэд. А. А. Каваленя, С. Я. Новшау. - Мшск, 2004. - С. 144.
12. *Малыхша, Л.* Сацыял^тычная Савецкая Рэспубл^а Л^вы і Беларус / Л. Малыхша // Белар. п.ст. час. - 2003. - № 4. - С. 45, 49.
13. *Някляеу, У.* Шлях. Папулярны біяграфічны нарыс / У. Някляеу // Дзеяслоу. - 2007. - № 3. -С. 243.
14. *Платонов, Р.* Тернистый путь к свободе / Р. Платонов, Н. Сташкевич // Неман. - 1992. - № 10. - С. 155.
15. *Протько, Т. С.* Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917-1941 гг.) / Т. С. Протько. - Минск, 2002. - С. 323.
16. *Сідарэвіч, А.* Староны з псторып БНР / А. Сідарэвіч // Адраджэнне: п.ст. альманах / склад. і навук. рэд. А. П. Грыцкевіч. - Мшск, 1995. - Вып. 1. - С. 226.
17. *Туронак, Ю.* Мадэрная п.сторыя Беларус / Ю. Туронак. - В1льня, 2006. - С. 75, 210.
18. *Яновіч, С.* Беларусь заутра / С. Яновіч // ARCHE-Пачатак. - 2004. - № 2. - С. 73.